# Сцэнар Урока/ Прапанова праекту*

| | |
|---|---|
| **Краіна-партнэр** | Польшча |
| **Тэма уроку** | Удзел у публічным жыцьці – сіла камунікацыі |
| **Рэкамэндаваная велічыня групы** | 20-30 вучняў |
| **Рэкамэнаваны ўзрост вучняў** | ад 12 год |
| **Рэкамэндаваны час** | 90 хв. |
| **Мэты** | • Знаёмства з паняцьцем актыўнага ўдзелу ў грамадзкім жыцьці<br>• Знаёмства з інструмэнтамі публічнай камунікацыі<br>• Акрасьленьне ўмоваў добрай камунікацыі і супрацы<br>• Разьвіцьцё навыкаў знаходжаньня супольнага меркаваньня ў групе і правядзеньня дыскусіі. |
| **Мэты ўрока** | Пасьля ўрока вучань павінен:<br>• Ведаць способы камунікацыі і ўдзелу грамадзянаў ў вырашэньні праблемаў<br>• Разумець і тлумачыць на чым палягае удзел у грамадзкім жыцьці<br>• Умець клапаціцца аб датрыманьні умоваў добрай публічнай камунікацыі і выбіраць інструманты камунікацыі, што служаць для вырашэньня канкрэтных праблемаў |
| **Матэрыялы** | • Дэфініцыя актыўнага удзелу (з падручніка албо вікіпэыі)<br>• Выдрукаваная для кожнага вучня лесьвіца актыўнага ўдзелу разам з інструмантамі камунікацыі (гл. тэкст)<br>• Рознай вялічыні і кшталту карткі ў трох колерах.<br>• Белыя карткі і аркушы паперы<br>• Пісьмовыя прыборы<br>• Дошка альбо фліпчарт |

**Уводзіны:**
Прэзэнтацыя вучням тэмы лекцыі. Варта адзначыць, што падчас заняткаў трэба зьвярнуць увагу на тое, якімі сродкамі камунікацыі карыстаецца грамадзкая супольнасьць (як з пэрспэктывы грамадзяніна, так і з пэрспэктывы ўлады).

| **Заданьні настаўніка:** | **Заданьні вучня/вучняў:** |
|---|---|
| 1. На пачатку настаўнік запрашае вучняў ўзяць узел у сымуляцыйнай гульні.<br>• Папрасіце групу, каб яна села ў паўколе. Скажыце, што заданьне будзе складацца з чатырох частак і што для рэалізацыі заданьня патрэбныя две ахвотныя асобы. Ахвотнікі сядаюць наперадзепаўкола. Заданьне мадэруе настаўнік, пачынаючы і скончваючы кожны канкрэтны этап і ўводзячы чарговыя правілы.<br>• У першай частцы заданьня: ахвотнікі атрымліваюць заданьні, што маюць што трэцяй асобе даваць любую каляровую картку.Рэшце групы патлумачце, што іх мэтай | **Сымуляцыйная гульня (45 хв)**<br>• (25 хв) Вучні актыўна ўдзельнічаюць у заданьні. Ахвотнікі раздаюць карткі, іншыя спрабуюць іх атрымаць.<br>• (20 хв)Вучні бяруць удзел у дыскусіі на тэму мэханізмаў, каторыя дэмаскуе гэтае заданьне, матывацыі да актыўнага ўзелу ў заданьні і эмоцыях, каторыя ў іх былі падчас яго выкананьня. |

| | |
|---|---|
| ёсьць здабыцьцё як мага большай колькасьці картак.<br>• У другой частцы заданьня трэба падзяліць групу на 5-7 асабовыя падгрупы. Заданьнем кожнай групы будзе здабыцьцё як мага большай колькасьці картак. Асобы ў групе могуць выпрацоўваць супольную стратэгію дзеяньняў. Ахвотнікі надалей раздаюць карткі што трэцяй асобе.<br>• У частцы III: Настаўнік запрашае ахвотнікаў на раду. На хвілінку выходзіць зь імі з залі. Ахвотнікам даецца інструкцыя, што пасьля вяртаньня яны скажуць, што вырашылі кожнаму даць па адной картцы (кожнаму таго самага колеру). Па вяртаньні ў залю разаюцца карткі.<br>• У чацьвертай частцы на ошцы запісваецца лічбавая вартасьць карткі кожнага колеру. Заданьнем групаў зьяўляецца падлік, якая група атрымала найбольш.<br>• Падвядзеньне вынікаў:Спытайцеся ў вучняў, як яны сябе адчувалі падчас гульні і ў канкрэтных яе фазах. Чаму менавіта так? Што матывавала іх да дзеяньня, а што наадварот, стапавала актыўнасьць? Якія выпрацоўваліся стратэгіі для здабыцьця картак? Зьвярніце ўвагу на індывідуальную працу, на групавую працу, на ролю ахвотнікаў. Спытайцеся, якіх абшараў рэальнасьці магло б датыкаць гэтае заданьне?<br><br>• Сканчэньне: патлумачце сыстэму раздаваньня картак. Зьвярніце ўвагу на значэньне эмоцый і матывацый у прыянцьці рашэньняў. Падзякуйце за заангажаваньне ў супольны досьвед.<br><br>Перапынак<br><br>2. Навязваючы да папярэдняга заданьня, скажыце вучням, што ў наступнай частцы сустрэчы вы будзеце працаваць над тым, што зрабіць, каб пазбегнуць падобных сытуацый. На пачатку супольна акрэсьліце, якія могуць быць правілы добрай грамадзкай/публічнай (паміж грамадзянамі і ворганамі шыроказразумелай улады)камунікацыі, а потым якія інструманты служаць для разьвіцьця такой камунікацыі.<br><br>3. Перайдзіце да вызначэньня правілаў добрай публічнай камунікацыі. Настаўнік мадэруе заданьне зьвяртаючы ўвагу на час, можа хутчэй перайсьці да працы ў большых групах.<br>• Папрасіце вучняў, каб кожны індывідуальна напісаў на паперы 5 рысаў добрай публічнай камунікацыі. | **Умовы добрай камунікацыі (25 хвілін)**<br>• (15 хвілін) Вучні супольна ўсталёўваюць умовы добрай публічнай камунікацыі. Пачынаюць ад індывідуальнай працы, праз працу ў малых групах даходзяць да працы на форум.<br>• (10 хв) Вучні дыскутуюць на тэму працэсу супольнага прыняцьця рашэньняў. |



*Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.*

| | |
|---|---|
| • Пасьля папрасіце, каб яны ў парах абмеркавалі, чаму менавіта гэтыя рысы падаюцца для іх найбольш істотнымі і разам выбралі пасярод супольных 10 рысаў 5, паводле іх найважнейшых і запісалі на новым аркушы. Ад гэтага часу яны будуць супольна прэзэнтаваць гэты выбар.<br>• Папрасіце, каб пары стварылі 4-асобавыя групы, узаемна прэзэнтавалі свае выні і выбралі наступныя 5 рысаў.<br>• Спалучыце наступныя групы, ажно пакуль дойдзе да дыскусіі 2 групаў на форум і супольнага акрасьленьня 5 рысаў добрай публічнай камунікацыі.<br>• Падсумоўваючы абмяркуйце з групай працэс знаходжаньня супольнага рашэньня. Што было ля іх простае, а што складана? Ці ўсе ў поўнай меры згаджаюцца з канчатковым рашэньнем? Чаму так альбо не?<br>• Канец: скажыце, што праведзеныя падчас гэтага заданьня дыскусіі дасканала акрэсьлілі такое паняцьце як “актыўны ўдзел”.<br><br>4. Увядзіце паняцьце “актыўнага ўдзелу”ю Спытайцеся ў вучняў, з чым ён бы ў іх асацыяваўся. Адказы запісвайце на дошцы..<br>• Пасьля сабраньня адказаў вучняў прадстаўце дэфініцыю паняцьця.<br>• Прадстаўце вучням лесьвіцу “актыўнага ўдзелу” (намалюйце на дошцы/фліпчарце альбо высьветльце ў форме слайду). Прадстаўце асобныя формы прыступкамі, азначайце, якім чынам расьце ступень удзелу грамадзянаў ў прыманых рашэньнях.<br>• Патлумачце на чым палягае аднабаковая, двубаковая, сымэтрычная камунікацыя.<br><br>5. Запрасіце вучняў да азначэньня інструмантаў публічнай камунікацыі. Прывядзіце некалькі прыкладаў сытуацыяў, у якіх такая камунікацыя можа быць патрэбная, нп. У жыцьці школы, раёну, знайдзіце прыклады блізкія вучням, актуальныя ў мэдыях.<br>• Падзяліце вучняў на 3 групы, заданьнем кожнай групы зьяўляецца акумуляцыя ідэяў, якія інструманты, формы публічнай камунікацыі могуць быць патрэбнымі ў : a) інфармаваньні (аднабаковая камунікацыя), b) кансультаваньні (двубаковая камунікацыя), c) 3 – супольным прыняцьці рашэньня (сымэтрычная камунікацыя).<br>• Калі ўпэўніцеся, што ўсе групы скончылі працу, запрасіце іх да прэзэнтацыі на форум. Чальцы іншых групаў уносяць свае прапановы. | **Азначэньне “актыўнага ўдзелу”**<br>• Вучні робяць брэйнстормінг на тэму значэньня паняцьця “актыўны ўдзел”.<br><br>**Інструманты публічнай камунікацыі**<br>Вучні працуюць над пошукам як найбольшай колькасьці розных мэтоыкаў камунікаваньня паміж грамадзянамі і ўладай на ўзроўні інфармаваньня, кансультаваньня і супольнага прыняцьця рашэньяў.<br>Вучні прэзэнтуюць на форум вынікі працы асобных груп і дадаюць да іх свае ідэі. |



*Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.*

| | |
|---|---|
| **Падсумаваньне:**<br>Разайце вучням выдрукаваную лесьвіцу “актыўнага удзелу” разам з прыкладнымі інструмантамі публічнай камунікацыі, каторыя адказваюць акрэсьленай форме камунікацыі: інфармаваньню, кансультаваньню, супольнаму прыняцьцю рашэньняў. Заахвочвай да карыстаньня з гэтых інструмантаў пры вырашэньні какрэтных праблемаў. | |
| **Спасылкі да матэрыялаў on-line, каторыя трэба выкарыстоўваць падчас заняткаў** | http://pl.wikipedia.org/wiki/Partycypacja<br>www.partycypacjaobywatelska.pl/technika |

**Прапанаваная ацэнка заняткаў:**

Актыўны ўдзел у лекцыі
Навыкі працы ў групе
Здольнасьць а аргумэнтаваньня сваіх перакананьняў
Здаольнасьць пошуку практычных прымяненьняў ведаў, атрыманых падчас

Назіраньне настаўнікам/ выхаваўцам клясы спосабаў узаемнай камунікацыі паміж вучнямі і спосабаў кантакту з унутрашкольнымі ворганамі (іншыя клясы, настаўнікі, самаўрад, дырэкцыя) пры арганізацыі канкрэтных дзеяньняў, вырашэньні канкрэтных праблемаў.

**Крыніцы, на якіх збудаваная лекцыя**

Długosz D., Wygnański J.J., Obywatele współdecydują. Przewodnik po partycypacji społecznej, Warszawa, 2005, www.eu.ngo.pl/files/ue.ngo.pl/public/materialy_analizy/przewodnik_ost.pdf

www.partycypacjaobywatelska.pl
www.decydujmyrazem.pl/partycypacja

*калі датычыцца іншых формаў заняткаў, то просім зьмяніць

Апрацаваньне:Эльжбэта Окроы, Эва Окроы

*Публікацыя выражае толькі погляды аўтара і ня можа быць трактаваная як афіцыйная пазыцыя Міністэрства Замежных Справаў РП.*



*Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.*